**Important Bird Area:** Čyrvony Bor






© С. Левый

**Code:** BY047

**Central coordinates:** 56° 04'N 28° 34' E

**Location:** Vitebskaya voblast: Rasony region

**Area:** 36065 ha

**IBA Criteria:** A1, B2

**National conservation status:** ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Чырвоны Бор»

**International conservation status:** ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2010 годзе

## Site description:

Тэрыторыя заказніка ўяўляе сабой вялікі лясны масіў з мазаічнымі ўкрапінамі мноства верхавых балот і азёр. Акрамя таго, гэта мясцовасць багатая на маляўнічыя малыя рэкі. На ўсходзе і захадзе мяжа заказніка праходзіць па дзвюх сярэдніх па велічыні рэках Нішча і Свольна. Да паўночнай мяжы прымыкае Себежскі рэгіянальны парк Расіі. Дзякуючы вялікай забалочанасці і слаба развітай дарожнай сетцы, гэту тэрыторыю людзі амаль што не наведваюць. У заказніку дамінуюць лясныя ландшафты, якія пакрываюць 82% тэрыторыі. Пераважаюць старыя ельнікі і хвойнікі, па паніжэннях – алешнікі. Большая частка балот

адносіцца да верхавога тыпу, нізінныя балоты размешчаны ў поймах рэк і ля падножжаў узгоркаў. У заказніку каля 40 азёр, большасць з якіх мае чыстую, празрыстую ваду і небагаты, але унікальны жывёльны і раслінны свет.

Па папярэдніх дадзеных флора судзістых раслін ТВП "Чырвоны Бор" прадстаўлена 643 відамі. У яе складзе 4 віда дзеразы, 6 - хвашчоў, 14 - папаратнікаў, 3 - голанасенных і 616 - пакрытанасенных.

Асноўны від дзейнасці чалавека на тэрыторыі – лесакарыстанне, праводзіцца збор ягад і паляванне. Сельскагаспадарчая дзейнасць амаль не вядзецца. Сельгасугоддзі невялікімі ізаляванымі ўчасткамі размяшчаюцца на поўдні заказніка.

## Habitats:

Лясы – 82%, балоты (у асноўным верхавыя і пераходныя) – 14%, азёры – 3%, іншыя землі – 1%.

## Birds:

Асаблівая каштоўнасць тэрыторыі заключаецца ў наяўнасці вялікай колькасці паўночных відаў, паўднёвыя межы распаўсюджання якіх праходзяць па тэрыторыі Беларусі. Сярод іх трэба адзначыць глушца *Tetraourogallus* (колькасць гэтага віду – 250 асобін – самая высокая ў рэспубліцы), белабровага дразда *Turdusiliacus*, даўгахвостай кугакаўкі *Strixuralensis*, касматаногага сыча *Aegoliusfunereus*. На тэрыторыі заказніка знаходзяцца адзінкавыя на Беларусі месцы гнездавання рэліктавых вадаплаўных птушак – чорнаваллёвага гагача *Gaviaarctica* і вялікага савука *Mergusmerganser*; даволі шматлікі тут рэдкі для іншых рэгіёнаў Беларусі звычайны гогаль *Bucephalaclangula* (15-20 пар). На верхавых балотах сустракаюцца пардва *Lagopuslagopus*, сярэдні кулён *Numeniusphaeopus* і залацістая сеўка *Pluvialis apricaria*. Тэрыторыя стварае аптымальныя ўмовы для гнездавання такіх рэдкіх птушак як арол-маркут *Aquilachrysaetos*, скапа *Pandionhaliaetus*, арол-вужаед *Circaetusgallicus*, арлан-белахвост *Haliaeetusalbicilla* і чорны бусел *Ciconianigra*.

## Other animal groups:

У межах ТВП ўсталявана абітанне 34 відаў звяроў, 9 відаў земнаводных і 5 відаў рэптылій.

Даволі высокая колькасць у заказніку і многіх рэдкіх млекакормячых: бурага мядзведзя *Ursus arctos*, рысі *Felis linx*, ваўка *Canislupus*, выдры *Lutralutra*. Ва ўгоддзях многа янотападобнага сабакі *Nyctereutesprocyonoides* – інтрадуцыраванага віда, які абмяжоўвае колькасць глушца *Tetraourogallus*, цецярука *Tetraotetrix* і іншых курападобных.

## Populations of IBA trigger species:

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Goosander *Mergus merganser* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Willow grouse *Lagopus lagopus* | B? | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Black-throated diver *Gavia arctica* | B | 1-3 breeding pairs | 2005-2010 | Medium | | |
| Black stork *Ciconia nigra* | B | 6-8 breeding pairs | 2005-2010 | Medium | | |
| White-tailed eagle *Haliaeetus albicilla* | B | 1-2 breeding pairs | 2005-2010 | Medium | | |
| Short-toed eagle *Circaetus gallicus* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Golden eagle *Aquila chrysaetos* | B | 1 breeding pairs | 2005-2010 | Good | ↔ | |
| Osprey *Pandion haliaetus* | B | 4-6 breeding pairs | 2005-2010 | Medium | | B2 |
| Merlin *Falco columbarius* | B | 0-1 breeding pairs | 2005-2010 | Poor | | |

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Golden plover *Pluvialis apricaria* | B | 14-20 breeding pairs | 2010 | Medium | ↑ | |
| Black-tailed godwit *Limosa limosa* | B | 16-20 breeding pairs | 2010 | Medium | ↔ | A1 |
| Whimbrel *Numenius phaeopus* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Curlew *Numenius arquata* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Greenshank *Tringa nebularia* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Ural owl *Strix uralensis* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Three-toed woodpecker *Picoides tridactylus* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |

## Other biodiversity:

Звяры: барсук*Melesmeles*.

Расліны: бяроза карлікавая *Betulanana*, шпажнік чарапіцавы*Gladiolusimbricatus*, лінея паўночная*Linnaeaborealis*, тайнік сэрцападобны *Listeracordata*, гарлачык жоўты малы *Nupharpumila*, марошка прысадзістая *Rubuschamaemorus*, нітэлопсіс прытуплёны *Nitellopsisobtusa*, баранец звычайны *Huperziaselago*, гайнік цёмна-чырвоны*Epipactisatrorubens*, касач сібірскі *Irissibirica*, тайнік яйцападобны*Listera ovata*, палушнік азёрны*Isoeteslacustris*

## Threats:

Лесакарыстанне, якое не ўлічвае значнасці лясных масіваў для захавання біяразнастайнасці.

Парушэнне спакою птушак і жывёл пры зборы ягад і ў час палявання.

## Recommendations for the conservation:

Патрэбны дадатковыя даследаванні для выяўлення неспрыяльных фактараў і распрацоўкі рэкамендацый па іх устраненні.

## References:

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Бірукоў В.П., Іваноўскі У.В.)

Обоснованіе заказніка

Данные моніторінговых учетов Яковца Н.

**Authors :** Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*